На магіле ўзыду
дубам,
Пачну шаптаць
братнім губам
Аб іх долі, аб свабодзе,
Стану песняй у
народзе!

Досі, крыкнем:
"Мы ў хаце, у Беларусі,
у сваім краю.
Сведкі – сонца, дубы з
гаю...

І душна, і цесна,
і сэрца самлела
Мне тут на чужыне,
здалёк ад сваіх...
Як птушка на скрыдлах,
ляцець бы хацела,
Як хваля па моры, плыла
бы да іх!

Думаць усюды аб народзе,
Родны край усюды сніць...

А на задушкі пад
цёмнаю івай
Жывое пачуецца слова,
Што песня ўстала з
стотысячнай сілай,
Жыве мая ліра нанова!

Развівайцеў сябе любоў да чалавека, - і для вас заўсёды будзе дораг родны край і народ.
Развівайце любоў да народа, - і сэрца вашаў сталыя гады будзе адклікацца гарачым пратэстам на кожную крыўду.
Развівайце міласць да слабых і загнаных, - і ніколі не забудзецеся ў шчасці абнядолі, што на свеце пануе, і ніколі не паложыце рук, кажучы:”Мы сваё адпрацавалі, - няхай іншыя становяцца на работу!”

Роднае слова! З малых дзён чуем мы цябе з матчыныхвуст.Ты нам тлумачышусе дзівы свету, якія дзіцячае вока бачыць навокал сябе першы раз. І табе выказваем мы свій дзіцячы жаль, крыўду, жаданне, радасць... Чаму ж, роднае слова, гэтак часта забываюць цябе людзі – нават тут, між сваімі? Чаму сыны нашага народа так лёгка адракаюцца ад матчынай гутаркі? Бедны той, хто ...не мае скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здалее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы... Яна, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць.

Горка рэдзька – ды ядуць.
Кепска замужам – ды йдуць,
Хоць за вала,
толькі б ў хаце не была!

Абяцанка-цацанка, а дурному радасць. Часта абяцаюць, рэдка датрываюць.

Не пій мёду, не стаў хаты,
Пакуль у руках пуста!
Не хваліся, што багаты!
Не кажы, што густа,
Пакуль крупнік, як вадзіца,
Буракі без квасу,
Не кажы: “Грашэй крыніца,
Злічыць няма часу!”

Калі птушачкай ляцець да роднай вёскі, то тры мінуты, калі канём ехаць,то паўдня, цвярозы чалавек за адзін дзень дойдзе, а п'яны за тры не дакоціцца...

# Авечка сярод ваўкоў, а ваўкі ані чэп!

Беларусы!
Больш нікому
Не ўступайце вы загону
Свайго жніва, сваёй
працы.

Моладзь, - вы сіла ў
кожнае хаце,
Вы – сонейка, радасць
для бацькі, для маці,
Вучыцесь, старайцесь,
багаццесь у сілы,
Бо жджэ вас з надзеяю
край наш радзімы.

Па шляхоцкі – на палове клёцкі, а ў мужыцкім шчоцы – па тры клёцкі ў роцы.

Пільнуй гаспадаркі,
будуць у гаршку
скваркі.

# Вольнаму воля, шалёнаму поле, а святому рай.

...светлая думка развейвае цемру ночы...

Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму.

Мы не з гіпсу, мы – з камення, мы – з жалеза, мы – са сталі, нас кавалі у пламенні, каб мацнейшымі мы сталі. Цяпер, братцы, мы з граніту, душа наша з дынаміту, рука цвёрда, грудзь акута, пара, братцы, парваць пута!

Але цяжкае жыццё,
змаганне за кусок хлеба,
крыўды і несправядлівасці,
якія спатыкаем мы на сваёй
дарозе,– усё гэта, быццам тое
балота, забівае ў нас
найлепшую частку душы:
любоў да чалавека.

Кабеты таксама злягчэе доля, як даб'юцца роўных правоў з мужчынамі.

Захавайце ж сэрцы вашы чыстымі на ўсё жыццё і памятайце, што светлыя сны вашы аб волі, роўнасці і брацтве збываюцца, што з усходам сонца яны не рассейваюцца разам з цемрай начной, а становяцца праўдай жыццёвай.

# Прыйдзе час – папараць-кветка дастанецца табе ў рукі.

Бедны той, хто, апрача
грошы, апрача багацця,
каторае пры першым
няшчасці счэзне дазвання,
не мае скарбаў вечных –
скарбаў душы.

Але поруч з любоўю да сваіх братоў патрэбна яшчэ нешта, што злучае людзей у суцэльны народ — гэта родная мова. Яна, быццам цэмент, звязывае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць.

Асенняе неба і хмарна і зімна... не адкажа вам, пажоўклыя лісточкі. Вецер толькі закалыша і знікне. Адзін звон мо па вас заплача шчыра, а зямля-маці прытуліць спрацаваныя косці. Елка або бяроза пусціць карэнне ў вашы збалелыя сэрцы, выцягне з іх усю горыч і вынесе ў вясёлай зелені суроваму свету... канец мукі.

Развівайце ў сябе любоў да чалавека,- і для вас заўсёды будзе дораг родны край і народ.

Развівайце любоў да народа, – і сэрца ваша ў сталыя гады будзе адклікацца гарачым пратэстам на кожную крыўду.

# Хацела быць я рэчкай быстрай, абегчы родны край!

Ой, як мілы
родны край!
Палацеў бы,
як у рай!

На небе сонца
шчасця усходзіць,
Толькі патрэбна
хмары прагнаць.

Хто любіць свой народ, хто ў кожным бачыць брата-чалавека, той не сагнецца перад крыўдай і перад здзекам...

Скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здалее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы...

Будучыня
дзержыцца на вас,
моладзі, – будучых
грамадзянах сваёй
старонкі...

Развівайце любоў да народа, і сэрца ваша ў сталыя гады будзе адклікацца гарачым пратэстам на кожную крыўду...

Сэрцу нашаму песня дае пацеху, а дзеткам, слухаючым яе, -жывую навуку...

# Хто дбає, той має.